Источник: "Звязда" - 2025-04-03

## 3 КРАСАВІКА Даты Падзеі Людзі




**1885** год — нарадзіўся Барыс Вількіцкі, рускі марскі афіцэр, капітан 1-га рангу, гідрограф, геадэзіст, даследчык Арктыкі, першаадкрывальнік Паўночнай Зямлі. Беларус па паходжанні. Імем Вількіцкага былі названы астравы ў моры Лапцевых, адкрытыя экспедыцыяй Амундсена ў 1919 годзе. Навуковец унёс шэраг канструктыўных прапаноў па арганізацыі суднаходства па так званым Карскім марскім шляху, удзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні Карскіх экспедыцый, забяспечыў паспяховы пераход вялікіх груп транспартных суднаў і грузавыя аперацыі.

**1890** год — нарадзіўся Барыс Маркавіч Шпенцэр, вучоны ў галіне хімічнай тэхналогіі, доктар хімічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі. Быў членам прэзідыума і вучоным сакратаром Камітэта па хімізацыі СССР, старшынёй Савета па вывучэнні прадукцыйных сіл Беларусі і кіраўніком сектара хімічнай тэхналогіі Інстытута хіміі АН БССР.




**1885** год — нямецкі інжынер Готліб Даймлер атрымаў патэнт на аднацыліндравы рухавік унутранага згарання з вадзяным ахаладжэннем.

**1920** год — нарадзіўся Юрый Нагібін, рускі савецкі пісьменнік. Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцяў «Перад святам», «Далёкае і блізкае», «Завулкі майго дзяцінства» і інш. Шмат пісаў на беларускім матэрыяле. Паводле яго аповесці «Старонкі жыцця Трубнікава» пастаўлены фільм «Старшыня»; правобраз галоўнага героя — старшыня калгаса «Рассвет» Магілёўскай вобласці К. П. Арлоўскі. Аповесць «На ціхім возеры» прысвечана нарачанскім рыбакам.

**1924** год — нарадзіўся Марлон Брандо, вядомы амерыканскі акцёр кіно. Здымаўся ў фільмах «Трамвай «Жаданне», «Апошняе танга ў Парыжы», «Хросны бацька», «Востраў доктара Мора» і інш.

**1973** год — амерыканскі вынаходнік Марцін Купер здзейсніў першы ў гісторыі званок з сотавага тэлефона. І тэлефанаваў інжынер фірмы Motorola не каму-небудзь, а свайму галоўнаму канкурэнту — Джаэлу Энгелу, супрацоўніку кампаніі Bell Laboratories, які вёў распрацоўкі ў тым жа кірунку.